# ПАСЛАННЕ СВЯТОГА ЮДЫ

**1** [1]Юда, слуга Езуса Хрыста, брат Якуба, – пакліканым, якіх умілаваў Бог
Айцец і захаваў Езус Хрыстус. [2]Няхай памножацца ў вас ласка, спакой і любоў.

**Мэта паслання**

[3]Умілаваныя, з усёй руплівасцю пішу вам пра нашае супольнае збаўленне. Я
палічыў неабходным заахвоціць вас змагацца за веру, раз перададзеную
святым. [4]Бо закраліся між вас нейкія людзі, здаўна прызначаныя на гэтае
асуджэнне, бязбожнікі, якія ласку Бога нашага замянілі на разбэшчанасць і
выракаюцца адзінага Валадара і нашага Пана, Езуса Хрыста.

**Перасцярога перад фальшывымі настаўнікамі веры**

[5]Хачу нагадаць вам, хоць вы ўсё ведаеце, што Пан вывеў народ з зямлі
егіпецкай, а тых, хто не паверыў, знішчыў. [6]Анёлаў, якія не захавалі сваёй
годнасці і пакінулі сваё жыллё, Ён трымае ў вечных путах у цемры аж да
вялікага суднага дня. [7]Падобна Садома і Гамора, і навакольныя гарады, што
таксама жылі ў распусце і пажадлівасці іншага цела, сталіся прыкладам
пакарання вечным агнём.

[8]Тое ж будзе і з гэтымі мройнікамі, якія апаганьваюць цела, адкідаюць
Божую ўладу, зневажаюць нябесныя істоты. [9]Нават арханёл Міхал, калі гаварыў
з д'яблам, спрачаючыся за цела Майсея, не адважыўся вынесці прысуд знявагі,
але сказаў: *«Няхай Пан цябе пакарае!»* [10]А гэтыя зневажаюць тое, чаго не
ведаюць, а што, як неразумныя жывёлы, па прыродзе ведаюць, тым сябе
знішчаюць. [11]Гора ім, бо пайшлі шляхам Каіна. Дзеля ўзнагароды Балаама
ўчынілі ашуканства і загінулі як узбунтаваны Карэй. На вашых гасцінах любові
яны – ганьба, банкетуюць з вамі без страху, дагаджаючы сабе! [12]Гэта аблокі
бязводныя, што вецер ганяе, гэта восеньскія дрэвы, бясплодныя, цалкам
засохлыя і выкаранёныя, [13]гэта дзікія хвалі марскія, што пеняцца сваім сорамам,
зоры блукаючыя, для якіх змрок цемры навекі наканаваны.

[14]Прарочыў пра іх Энох, сёмы пасля Адама, кажучы: «Вось прыйшоў Пан з
мірыядамі святых, [15]каб учыніць суд над усімі і дакарыць кожнага за ўсе ўчынкі
бязбожнасці і за ўсе жорсткія словы, сказаныя супраць Яго бязбожнымі
грэшнікамі». [16]Яны заўсёды наракаюць, скардзяцца на лёс, паступаюць паводле
сваёй пажадівасці, а вусны іхнія гавораць пыхліва і лісліваць іншым дзеля
сваёй карысці.

**Заклік да веруючых**

17Вы ж, умілаваныя, памятайце словы, сказаныя раней Апосталамі нашага
Пана Езуса Хрыста, 18які кажа вам, што ў апошнія часы з’явяцца насмешнікі,
якія будуць паступаць паводле сваіх бязбожных жаданняў. 19Гэта тыя, хто сее
падзелы, кіруецца інстынктамі і не мае Духа.
20Але вы, умілаваныя, будуйцеся на найсвяцейшай веры вашай і маліцеся ў
Духу Святым. 21Захоўвайце сябе ў любові Божай і чакайце міласэрнасці нашага
Пана Езуса Хрыста дзеля жыцця вечнага. 22Да адных, што сумняваюцца,
будзьце міласэрныя; 23другіх ратуйце, выхопліваючы з агню; яшчэ іншым
спачувайце асцярожна, ненавідзячы нават вопратку, апаганеную целам.

**Заключная даксалогія**

24А таму, хто можа зберагчы вас ад падзення і паставіць перад аблічча
славы сваёй беззаганнымі і радаснымі, 25Богу адзінаму, Збаўцы нашаму, праз
Езуса Хрыста, нашага Пана – слава, веліч, панаванне і ўлада перад усімі вякамі,
цяпер і на ўсе вякі вечныя. Амэн.

© Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, Мінск 2017